**ЛЕКЦЫЯ** (ад лац. lectio – чытанне) – славесны метад навучання ў форме маналога, у якім настаўнік сістэмна, паслядоўна выкладае, як правіла, тэарэтычны матэрыял. Метад лекцыі выкарыстоўваецца ў старшых класах, на ўроках, прысвечаных аглядавым тэмам, біяграфіі пісьменніка. У форме лекцыі могуць быць праведзены ўступныя і заключныя заняткі пры вывучэнні манаграфічнай тэмы або твора вялікай формы. У пачатку працы над творам настаўнік дае вучням новую інфармацыю (задума, гісторыя напісання, час напісання, час, адлюстраваны ў творы). На заключных занятках з дапамогаю лекцыі сістэматызуюцца веды школьнікаў.

Асноўныя дыдактычныя патрабаванні да школьнай лекцыі: ідэйнасць, эмацыянальнасць выкладу, цэласнае раскрыццё тэмы і аналіз канкрэтных фактаў і з’яў у літаратурным працэсе і іх абагульненне, дакладнасць аргументацыі і навуковая доказнасць вывадаў; выкарыстанне настаўнікам разнастайных метадычных прыёмаў: выразнае (мастацкае) чытанне твораў, дэманстрацыя наглядных дапаможнікаў, твораў выяўленчага мастацтва, вучэбных кінафільмаў, дыяфільмаў, выкарыстанне элементаў эўрыстычнай гутаркі, відэа- і аўдыёзапісаў і г. д.

У лекцыі даецца падрабязная характарыстыка найважнейшых фактаў, з’яў, падзей і коратка выкладаецца другасны матэрыял. Настаўнік звычайна карыстаецца прыёмам канкрэтызацыі, калі складанае паняцце раскрываецца на адным або некалькіх пераканаўчых прыкладах. Вывады і абагульненні могуць ісці за фактамі як вынік аналізу фактычнага матэрыялу або, наадварот, падмацоўвацца канкрэтнымі фактамі, якія пацвярджаюць вывады, заканамернасці, сфармуляваныя настаўнікам.

У пачатку лекцыі выразна фармулюецца тэма, паведамляецца і запісваецца на дошцы план, да якога настаўнік пастаянна звяртаецца на ўроку.

Заканчваючы разгляд аднаго пытання, настаўнік робіць вывады і называе наступнае пытанне. Дакладнае дзяленне лекцыі на асноўныя пытані палягчае яе слуханне і засваенне. З набыццём вучнямі вопыту слухаць лекцыю план запісваецца толькі ў сшытку пад дыктоўку, пазней – план паведамляецца вусна, а вучні фіксуюць яго ў ходзе лекцыі.

Замацаванне пройдзенага матэрыялу адбываецца па пытаннях, вызначаных планам. Пры адсутнасці матэрыялу ў падручніку вучні складаюць тэзісы або канспект лекцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ